Марыя Ляшук

Апавяданні



Ляшук Марыя Іванаўна нарадзілася 27 верасня 1955 года ў вёсцы Табулкі Пінскага раёна, дзе вучылася ў мясцовай сярэдняй школе. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ (1978). Працавала карэспандэнтам, а затым рэдактарам радыё ў трыкатажным аб'яднанні «Палессе» (Пінск). З 1990 года была карэспандэнтам, загадчыкам аддзела пісьмаў, намеснікам рэдактара, а паміж 1996 і 2012 гадамі — рэдактарам газеты «Пінскі веснік». У 2012—2017 гадах — памочнік дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і карэспандэнт «Пінскага весніка», уласны карэспандэнт абласной газеты «Народная трыбуна».

Аўтар кнігі «Бласлаўёныя небам» (Пінск, 2006), «Сквозь зимы и вёсны» (Мінск, 2022)

Лаўрэат літаратурнай прэміі Брэсцкага аблвыканкама імя Ул. Калесніка ў намінацыі «Проза» (2022).

Святло скрозь непагадзь

— Маня! Ма-а-ня! Ды адарвіся ты нарэшце ад гэтай сваёй праклятай працы. Я зараз табе такое раскажу — упадзеш.

— Вечна ты, Ганна, збіраеш усякую небываліцу дый выдаеш за рэчаіснасць.

— Чыстую праўду, Манечка, буду гаварыць. Чыстую праўду. Ну сядзь ты нарэшце і паслухай. Сяброўка называецца. Усё сумняваешся ўва мне.

— Ну добра, не бурчы. Расказвай.

— Учора гэта было, бліжэй да вечара. Сяджу ля акна, вяжу камізэльку і раптам бачу: каля дома Жыгароў легкавік чорны спыніўся, такі вялікі, прыгожы. Пэўна, іншамарка.

— Ну, далей, далей, Ганна, не стамляй.

— Не прыспешвай, усё па парадку. Трое з яе выйшлі — мужчына і дзве жанчыны. Якая маладзейшая, букет вялізны жоўты ў руках трымала. Падышлі яны да веснічак, а іх і адчыняць не трэба — даўно з петляў знятыя. Ды і падворак увесь у быльнягу. Як з'ехаў Мікалай пасля пахавання бацькі, так усё былём і парасло. Нікому няма клопату да чужой гаспадаркі. А ў ранейшыя часы, памятаеш, які быў там парадак — і ў хаце, і каля яе. Заможна жылі Жыгары, Дзям'ян — на ўсю акругу гаспадар.

— Толькі вось шчасця ў іх доме і не было. Кацярына Пятроўна пайшла на той свет неяк раптоўна. Усё за Кольку свайго перажывала. Жыццё яго з маладых гадоў пайшло наперакасяк.

— Яна, Кацярына, і вінаватая ў тым. Я ж, як цяпер, памятаю прыезд той няшчаснай дзяўчыны да іх. Якая размова была ў хаце, не ведаю, але Кацярына, раз'юшаная, ледзь не кулакамі выштурхнула маладзіцу. Не саромеючыся людзей, крычала ёй у твар абразы. Маўляў, невядома ад каго ты панесла, а Колю бацькоўства прыпісваеш. Не станеш ты нашай нявесткай! А дзяўчынка ўжо на сёмым месяцы была. Маленькая такая, спалоханая. Колька сам не рашыўся маці расказаць, няшчасную гэтую падаслаў. А потым нават на аўтобус не правёў яе — схаваўся далей ад матчынага гневу.

— Кацярына і нявесту яму неўзабаве сама падабрала з добрым пасагам, багатую. Вунь якое вяселле забабахалі — на ўсю акругу звінела.

— Звону, сапраўды, было шмат. Ды шчасця за ім не было — бяздзетнай аказалася нявестка Пятроўны. Куды толькі ні ездзілі з ёй — і да лекараў, і да знахараў, адказ аднолькава атрымлівалі: не будзе ў яе дзяцей.

— Ганна, ну ты ж памятаеш, што і тут Кацярына распарадзілася: не трэба, маўляў, вам разбягацца, дзіця з дзіцячага дома вазьміце ды гадуйце. Не-е-е, не пра сына свайго яна дбала — багацце губляць не хацела.

— Узяць жа яны ўзялі, ды абы-якой маці аказалася жонка Мікалая, таму неўзабаве вярнула дзіцятка. А Колю пад абцас узяла. Разышліся яны ўсё ж. Мікалай і на пахаванне бацькі адзін прыязджаў. Бацькоўскі дом не прадаў, а за пару гадоў вунь якое запусценне там.

— Ганна, нешта ў другі бок наша размова пайшла. І што тыя трое? Хто яны?

— Каб уразумець гэта, я і пайшла да суседскага дома. І... аслупянела: з букетам у руках на мяне глядзела... Кацярына Пятроўна! Вылітая яна ў маладосці! Усе кропелькі пазбірала тая юная асоба. Я спачатку нават словы вымавіць не змагла. Толькі потым загаварыла з імі. І магілкі Кацярыны і Дзям'яна паказала. Рыдала моцна тая, што старэйшая. А дачка яе з мужам усё пра Мікалая пыталіся. І я...

— Ганна, не цямні. Дагаворвай.

— Дала я адрас Колькі... А раптам яшчэ наладзіцца яго жыццё?

Час наліўных яблыкаў

Той верасень выдаўся на здзіўленне цёплым. Праўда, ранішняя прахалода нагадвала аб восені. А вось апоўдні сонейка грэла зямлю па-летняму. І нават лёгкі ветрык, які ляніва гуляў з лісцем яблынь, быў ласкава-цёплым і не астуджаў разгарачаныя працай твары.

Ураджай яблыкаў быў небывалы, і кожная пара рук шанавалася ў мясцовай гаспадарцы. Запрашаліся ўсе ахвочыя.

Запісалася на ўборку і Кацярына, бо плацілі тут за працу годна. Ужо два гады, як пайшла яна на пенсію. Грошай хапала толькі на неабходнае. Яшчэ нядаўна займала яна нядрэнную пасаду, любіла сваю працу, хоць аплата за яе не адпавядала штодзённым выдаткам сіл і энергіі. Таму і пенсію налічылі сціплую. Кацярына не наракала, жыла, як жылося, і не саромелася на заслужаным адпачынку падзарабляць у прыватнікаў на праполцы градак, зборы гародніны і садавіны. Дадатак да пенсіі быў адчувальны, калі папрацаваць месяц-другі. На гэта і разлічвала Кацярына, выпраўляючыся на чарговую падпрацоўку.

На месцы збору да яе прыходу было ўжо нямала людзей. Маленькія і вялікія групы гаманілі аб сваім. Але сярод усіх непрыемна вылучаўся гучны барытон. Упэўненасць у сабе, перавага над шэрагам тых, хто стаяў побач, і нават грэбаванне чуліся ў кожным вымаўленым ім слове. Кацярына мімаволі скурчылася і адышла ў іншы бок. Аўтобусы, што падаспелі, былі вельмі дарэчы, можна было пераключыцца на ўспрыманне чагосьці іншага. Як аказалася, ненадоўга.

Праціскаючыся ўглыб салона на больш-менш вольную прастору і ўхапіўшыся нарэшце за ручку сядзення, Кацярына раптам зразумела, што стаіць побач з тым самым «барытонам», як паспела ў думках назваць яго жанчына. Высокі, моцнага целаскладу, з пышнымі сівымі валасамі і пранізліва-вострымі карымі вачыма, ён нязмушана сядзеў на сядзенні і нават не меў намер саступіць яго каму б там ні было.

— У нашым палку новенькая, ці што? — прагрымеў «барытон», звяртаючыся ці то да Кацярыны, ці то да жанчыны, якая стаяла побач з ім.

— Хвалюе цябе, Валера, — з дакорам сказала тая і ўсё ж пацвердзіла: — Новенькая, — а потым перавяла размову ў іншае рэчышча.

Кацярына ў думках падзякавала суразмоўніцы «барытона», бо зусім не жадала ўступаць у дыялог з непрыемным ёй чалавекам. Яна не мела звычкі дзяліцца падрабязнасцямі свайго жыцця з малазнаёмымі ёй людзьмі. Так было заўсёды. Сёння яна працуе з аднымі, заўтра — з іншымі. І што, кожнаму душу раскрываць, дзяліцца патаемным, загружаць сваімі праблемамі? Навошта? Таму Кацярына больш слухала, чым гаварыла.

Па прыбыцці на плантацыю зборшчыкі яблыкаў сабраліся ў брыгады, сфарміраваныя яшчэ да прыезду Кацярыны. Яна стаяла збоку, чакаючы запрашэння ў адну з іх. «Барытон», як працягвала сама сабе называць яго Кацярына, адразу ж заспяшаўся да прадстаўнічага мужчыны, які стаяў у цэнтры, аб нечым перагаварыў з ім і пакрочыў наўпрост да Кацярыны.

— Будзеш у нашай брыгадзе працаваць, — без хітрыкаў заявіў ён і нецярпліва пацягнуў за сабой.

Супраціўленне выглядала б смешным і прыцягнула б усеагульную ўвагу, таму Кацярына паслухмяна рушыла ўслед за «барытонам».

Жанчыны ў брыгадзе аказаліся ветлівымі і адкрытымі, адразу прапанавалі перайсці на «ты» і наперабой пачалі знаёміць Кацярыну з тонкасцямі правільнага збору яблыкаў. Адначасова балбаталі аб хатніх клопатах. Кацярына нікому не расказвала пра сваё.

Яна хутка ўцягнулася ў працу, не адставала ад іншых. Спрытна напаўняючы вядро наліўнымі пладамі, хутка адносіла іх да трактара, дзе на пагрузцы стаяў Валерый. Ва ўласцівай яму манеры ён груба жартаваў, адпускаў салёныя слоўцы. Звыклыя да гэтага жанчыны ў такой жа манеры адказвалі яму. Падобнае бянтэжыла Кацярыну, і яна проста маўчала, не ўлазячы ў сварку. Толькі аднойчы, калі «барытон» вельмі ўжо дапёк яе, яна спапяляльным позіркам працяла гэтага няўрымслівага здаравяка, тым самым спыніўшы яго на паўслове. І далей па звычцы маўчала.

— Хто каго любіць, той таго чубіць, — жартавалі ў брыгадзе, назіраючы за незвычайнымі баталіямі.

Кацярыну падобныя выхадкі Валерыя і рэплікі жанчын, што працавалі побач, настолькі раздражнялі і выводзілі з раўнавагі, што яна цвёрда вырашыла праз дзень-другі сысці з працы.

Толькі задуманаму не наканавана было здарыцца. Восень — жанчына непрадказальная. У той дзень з раніцы святліла сонейка. А да абеду пачалі збірацца хмары, і лінуў дождж. Кожны хаваўся, як мог. Кацярына таксама дастала свой лёгкі тонкі плашчык, спехам прыкрываючыся ім ад пранізлівых струменяў. Толькі раптам наляцеў вецер, вырваў яго з рук жанчыны і падняў угору, як маленькую блакітную аблачыну. Страціўшы надзею, Кацярына накіравалася да найбліжэйшай яблыні, спадзеючыся пад яе кронай знайсці сховішча ад халоднай вільгаці. Не дабегшы, адчула над сабой полаг з плашч-палаткі. Разгубіўшыся ад нечаканасці, Кацярына паспрабавала вызваліцца, але моцныя мужчынскія рукі ўтрымлівалі яе, не адпускалі. Не ўласцівым яму ласкавым голасам «барытон» супакойваў, запэўніваў:

— Ну куды ж, дурненькая? Прамокнеш да ніткі. А там і захварэць нядоўга, — і мацней прыціскаў да сябе, саграваў.

Яна падпарадкавалася яго голасу, яго рукам і толькі маўчала, нібы ў сне ўспрымаючы тое, што адбываецца з ёй.

З таго дня паводзіны Валерыя рэзка змяніліся. Ён больш не грубіў, не хаміў, усё маўчаў і толькі задуменна глядзеў на Кацярыну. Яна ж па звычцы маўчала. Жанчыны ў брыгадзе з цікаўнасцю назіралі за абаімі, спрабуючы вывудзіць у Кацярыны хоць нешта цікавае для сябе. Калі нічога не атрымалася, як бы няўзнак паведамілі:

— Запаў ён на цябе, як піць даць — запаў. Бо даўно адзін, з таго часу, як вярнуўся з Афгана і даведаўся пра здраду жонкі. Не ўпусці, шкадаваць потым будзеш.

Кацярына, як звычайна, прамаўчала, толькі нізка нахіліла галаву, каб ніхто не ўбачыў слёз у вачах, і стала сутаргава збіраць яблыкі. Нельга ёй, нельга думаць аб нечым іншым, акрамя працы.

Скончыўся верасень. Заробленыя грошы выплачваліся ў касе сельгаспрадпрыемства. Да прызначанага часу прыбывалі ахайна і нават прыбрана апранутыя мужчыны і жанчыны, у якіх з цяжкасцю адгадваліся працаўнікі яблычных плантацый. Сярод усіх і на гэты раз выдзяляўся ён, Валерый. Чыста паголены, у дарагім гарнітуры, які тонка пахне таксама дарагой парфумай, ён, як заўсёды, прыцягваў погляды самотных жанчын, якія за доўгія месяцы працы побач так і не здолелі заняць месца ў яго сэрцы. «Барытон», ні на каго не зважаючы, адшукваў у ажыўленым натоўпе Кацярыну. А знайшоўшы, папрасіў адысці з ім убок, далей ад чужых вушэй. Гледзячы ёй проста ў вочы, рашуча прапанаваў:

— Выходзь за мяне.

Не адводзячы ад яе погляду, чакаў згоду. Яе не было. І мужчына, ужо не спадзеючыся ні на што, усё-такі задаў балючае для сябе пытанне:

— Чаму не?

— Я замужам ужо шмат гадоў, Валера. На жаль, хвароба прыкавала мужа да ложка, таму і прыходзіцца ездзіць на падпрацоўкі, каб лячыць яго, — нібы выдыхнула свой боль Кацярына. А потым, далікатна гледзячы на разгубленага мужчыну, прамовіла: — Дзякуй табе за ўсё. І будзь шчаслівы. Дзеля мяне, — усмешка ледзь кранула яе вусны. Толькі вочы здрадліва заблішчалі — ці то ад слёз, ці то ад сонца, якое прабівала свае промні скрозь восеньскія хмары.

Гардзей ды Мар'яна

Гардзей і Мар'яна жылі непадалёку адно ад аднаго. Абое даўно аўдавелі. Дзеці з абедзвюх сем'яў разляцеліся па розных гарадах і вёсках і з-за вялікіх адлегласцяў не так часта, як хацелася б, наведвалі бацькоў. Але не забывалі іх, тэлефанавалі, шчыра цікавіліся здароўем і дапамагалі матэрыяльна. А што яшчэ трэба вяскоўцам, якія звыклі ў любых праявах спадзявацца толькі на сябе? Хіба што суседзяў клікалі памагчы, калі самім немагчыма было ўправіцца.

Так і Мар'яна прасіла часам дапамогі ў Гардзея: то агарод узараць, плот падлатаць, дроў насекчы — ды ці мала дзе патрэбна мужчынская рука. А ў знак падзякі яна нярэдка карміла суседа смачным абедам ці вячэрай. Праўда, калі ён быў вольны ад той ці іншай сваёй пасіі, якая час ад часу з'яўлялася ў жыцці Гардзея.

— Час табе ўжо пасталець, Гардзей. Немалады як-ніяк, — і на гэты раз суботнім летнім вечарам журыла суседа Мар'яна, падкладваючы яму ў талерку чарговую порцыю сваіх кулінарных вынаходстваў.

— Час, — з апетытам аплятаючы смачны пачастунак, ахвотна згаджаўся Гардзей і тут жа з відавочным папрокам парыраваў: — Але ты ж не прымаеш

мяне да сябе і да мяне не хочаш перабрацца. Колькі разоў прапаноўваў табе гэта. Не памятаеш?

— Ды ну цябе, балабол ты гэтакі, — бянтэжачыся, перабіла яго Мар'яна. — Усё жарты жартуеш, не разумеючы, што і пакрыўдзіць можаш, — і ўжо чамусьці са злосцю працягнула: — Вунь якія маладухі каля цябе круцяцца. Куды ўжо мне да іх, кульгавай ды старой. Усё. Час дадому табе. Заседзеўся, — і стала хутка прыбіраць са стала.

Гардзей спрабаваў нешта запярэчыць, апраўдацца, але Мар'яна ўсім сваім выглядам паказвала, што размова скончана. На тым і разышліся, застаючыся кожны пры сваім меркаванні.

«Ну, Гардзей! Хутка сем дзясяткаў стукне, а ён туды ж, у жаніхі. Вядома, патрэбна яму гаспадыня ў хаце, цяжка мужыку і сваю, і бабскую працу выконваць. Але я тут прычым, кульгавая і даўно немаладая?» — разважала-пераконвала сябе Мар'яна.

Некалькі гадоў таму, калі разам з іншымі вяскоўкамі ехалі падводай на прастольнае свята ў суседнюю вёску, здарылася бяда. Нечага спалохаўшыся, конь панёсся па купінах ды калдобінах. Калёсы перакуліліся. Хтосьці з тых, хто сядзеў на іх, абышоўся ўдарамі ці нават толькі спалохам. А Мар'яне дасталася больш за ўсіх. Лячэнне траўміраванай нагі было доўгім і не зусім паспяховым — з'явілася кульгавасць. Мар'яна не камплексавала з гэтай нагоды: рабоце яе калецтва не перашкаджала. А замужжа, як яна лічыла, ёй не пагражала, каб саромецца і перажываць. «Так што, Гардзей, жыві ты сваім жыццём, а я — сваім. Ну, і што з таго, што за табой, як за каменнай сцяной, была б і хацела быць. Усё-ўсё! Размроілася! Час да нядзельнага дня рыхтавацца, а не ў аблоках лунаць», — і Мар'яна акунулася ў паўсядзённыя хатнія клопаты.

— Ну, Мар'янка, ну язва, — абураўся Гардзей усю дарогу дадому. — Так і стараецца падкалупнуць. Стары, ці разумееш. А старыя ці не маюць права на шчасце? Яшчэ як маюць. Вось сышла мая Надзея ў самым росквіце гадоў. З таго часу і маюся сам. Дзяцей на ногі паставіў, пра сябе не думаў. Ды і Мар'яна рана засталася ўдавой. Чаму б не сысціся хоць у сур'ёзных гадах ды і дажываць свой век разам. Дык не ж, упарціцца. Жарты, маўляў, жартуеш, крыўдзіш. Кульгавая, маўляў, іншых шукай. Ды не хачу я іншых, да яе душа цягнецца. Не разумее. А бяда з любым можа здарыцца.

Між іншым, яшчэ ў юнацтве цыганка напомніла мне, што ажанюся з кульгавай. Калі з Надзеяй сям'ю стварылі, пасмяяўся са словаў варажбіткі. Аказалася, дарма. Не, Мар'янка, не прывык я адыходзіць. І, здаецца, ведаю, як дагрукацца да цябе.

Па нядзельных днях і святах Мар'яна заўсёды наведвала храм. На царкоўныя службы ўвесь час клікала і Гардзея. У адказ ён абяцаўся, але ўсё адкладаў выкананне свайго абяцання. І Мар'яна вельмі здзівілася, убачыўшы ў царкве сярод тых, хто моліцца, чыста выгаленага, у строгім гарнітуры Гардзея. Ён заўважыў яе позірк і пачаў акуратна прабірацца да Мар'яны. Стаўшы побач, нахіліўся і ціхенька, каб чула толькі яна, прашаптаў: «Цяпер разам будзем хадзіць і ў храм, і дадому. А там, дасць Бог, і павянчаемся». Пярэчыць пачутаму Мар'яне чамусьці не захацелася. Словы, вымаўленыя пад высокія спевы, былі шчырымі і абяцалі дваім немаладым людзям ціхае сямейнае шчасце.

Ўвіла акацыя духмяная

Яе густы мядовы водар разносіўся па ўсёй акрузе, паколькі абсыпаныя белымі кветкамі кусты раслі, лічы, каля кожнай хаты. Праз адчыненае акно, завешанае ажурным цюлем, гэты салодкі пах сачыўся і ў пакой, дзе адпачывала Каця. Праз паўдрымоту, такую нязвыклую для яе ў дзённы час, яна чула асцярожныя крокі Андрэя ў суседнім пакоі.

Неўзаметку для сябе пагрузілася ў крохкі сон і ў спалоху ўскочыла, калі лёгкае покрыва раптам кранула яе цела.

— Ну, што ты, мілая? — Андрэй здзіўлена глядзеў на Кацю. — Чаго ты спалохалася? Не бойся, ён больш не асмеліцца крануць цябе. Адпачывай, а я скончу з абедам.

Каця зноў прылегла, але сон не ішоў. Перад вачыма адзін за адным праплывалі эпізоды яе горкага жыцця. Вінаваціць не было каго — сама выбрала яго і пакорліва несла свой крыж амаль паўтара дзясятка гадоў.

...Васіль быў відным на сяле і мужчынам, і гаспадаром. Высокі, станісты, чарнабровы і чорнавалосы, ён прыцягваў жаночы пол з першага позірку і першай размовы. І любая раставала ад яго ўвагі. Але за жонку ён узяў прыгажуню з суседняй вёскі.

Да трыццаці пяці ён меў вялізны, поўны дастатку дом, дваіх сыноў і быў паспяховым фермерам. Але вось характар як быў цвёрдым у юныя гады, такім і застаўся. Сказаў слова — і баяліся сямейнікі не паслухацца. Ды і наёмныя работнікі не спрабавалі пярэчыць — бессэнсоўна.

Здавалася, прыбытак яго сям'і будзе павялічвацца, аўтарытэт — умацоўвацца, і неўзабаве ён можа стаць гаспадаром жыцця. Ды толькі чалавек мяркуе, а Гасподзь вырашае.

Раптоўна пайшла з жыцця жонка Васіля: адарваўся тромб. І асірацелі дзеці, разгубіўся на час Васіль. Потым узяў сябе ў рукі і пачаў жыць далей. І пачалі зноў заглядвацца на яго мясцовыя прыгажуні. Адны праз знаёмых прапаноўвалі сябе ў жонкі, іншыя самі адкрыта ішлі з такой прапановай. Нібы звар'яцела і Каця. Як была пятнаццаці гадоў ад роду, убачыўшы Васіля, закахалася ў яго без памяці. І бацькі, і блізкія знаёмыя лічылі гэтае пачуццё дзіцячай дурнотай. А Кацюша пражыць не магла ні дня, каб нібы выпадкова не пабачыць Васіля. Яна кахала безнадзейна і неўзаемна. Стала сталейшай прыгожай станістай дзяўчынай, на якую зазіраліся шматлікія хлопцы. Андрэй быў адным з іх. Ён усяляк спрабаваў звярнуць яе ўвагу на сябе. Але ўсе яго спробы былі марнымі.

А Каця, аднойчы набраўшыся смеласці, пайшла ў хату да Васіля. Чырванеючы, бянтэжачыся, блытаючыся ў словах, стала казаць пра свае пачуцці, пра жаданне быць з ім побач заўсёды. Бессаромна аглядаючы Кацю з ног да галавы, Васіль не перабіваў, слухаў і толькі пад канец нібы рысу падвёў:

— Ды ты ж юная зусім. Якая з цябе можа быць жонка? Зрэшты... — у яго вачах раптам з'явіліся адкрыта юрлівыя агеньчыкі: — На ноч застанешся?

І Каця ахвотна кіўнула ў знак згоды. Праўда, засталася ў доме Васіля не толькі на ноч — нашмат даўжэй: паўтара дзясятка гадоў жыла з ім. Яе таемным марам аб прыгожым вяселлі, шчаслівым сямейным жыцці не наканавана было спраўдзіцца. Даведаўшыся праз час, што пад сэрцам б'ецца іншае жыццё, нясмела паведаміла пра гэта Васілю ў надзеі, што навіна ўзрадуе і яго. Аднак ён абыякава выслухаў Кацярыну, а потым холадна і жорстка вымавіў:

— У мяне ёсць дзеці, іншых мне не трэба. Так што, пакуль не позна, пазбаўляйся. Гэта па-першае. А па-другое, мяне задавальняе сужыцельства. Жонкай цябе ніколі не нараку. Калі і цябе задавальняе такі варыянт, жыві тут. А не — вось дзверы. Думай.

Каця бязгучна плакала ўсю ноч, а раніцой, як заўсёды, прыступіла да штодзённай гаспадарскай працы. Зрабіла ўсё, што патрабаваў Васіль. Спустошаная і адхіленая, машынальна чысціла, прыбірала, гатавала, мыла, без стомы працавала на градках — адным словам, служанка, ды і толькі.

Сыны Васіля з юных гадоў клікалі яе няйначай, як «Каця», і капіравалі стаўленне свайго бацькі да яе. Але Каця ўсё прымала як дадзенае. І не прыслухоўвалася ні да просьбаў бацькоў адысці ад такога жыцця, ні да просьбаў блізкіх людзей падумаць пра сябе, пра сваю больш шчаслівую будучыню. Нічые словы і парады не краналі яе сэрца, па-ранейшаму напоўненае далікатнымі пачуццямі да Васіля. Нягледзячы на ўсе жыццёвыя нягоды і выпрабаванні, Кацярына квітнела, станавілася сапраўднай прыгажуняй, набыла прывабную жаночую форму, што ўсё больш злавала Васіля, які старэў.

Прыдзіркі, неабгрунтаваныя падазрэнні пачашчаліся, хоць Каця і не дазваляла сабе думаць пра іншых мужчын. Але Васіль заўважаў захопленыя погляды нават маладых хлопцаў, якія яны затрымлівалі пры сустрэчы з Кацярынай, не кажучы ўжо пра яе аднагодкаў. І злосць незразумела на што і каго збіралася ў яго халоднай душы. Апраўданні ні ў чым не павіннай Каці катэгарычна адхіляліся.

І неяк за яе горкімі слязамі з'явіліся яго кулакі. Сінякі на твары яна тлумачыла няўдалым падзеннем, калі цікавіліся. І маўчала. Маўчала і цярпела. Аднойчы на вуліцы недалёка ад дома Васіля Кацю спыніў Андрэй. Знаходзячыся ў адпачынку пасля далёкага плавання, ён цікавіўся ў маці лёсам свайго першага кахання, Кацечкі з паралельнага класа. Маці ва ўсіх фарбах распісала яе жыццё. І вось Андрэй на свае вочы ўбачыў стомлены, у сіняках твар той, пра якую ён марыў усе гады. Абураны ўбачаным, мужчына кінуўся да Кацярыны, нягледзячы на яе пратэсты, моцна абняў, прыціснуў да сябе. І шаптаў, паўтараў, нібы малітву:

— Навошта ты церпіш гэтыя здзекі? Навошта? Навошта?

Прыціхлая Каця краем вока ўбачыла, як адчынілася брамка, як з'явіўся раз'юшаны Васіль з вялізным паленам у руках і хуткім крокам накіраваўся да іх. Каця паспела адштурхнуць Андрэя, які стаяў спінай да Васіля, убок, і цяжкі ўдар прыйшоўся ёй па плячы. Уміг сарыентаваўшыся, Андрэй учапіўся ў звар'яцелага ад злосці Васіля, адкінуў палена і стаў па тэлефоне выклікаць міліцыю.

У траўмапункце, зрабіўшы здымак, супакоілі: пераломаў няма, і, абязболіўшы, адпусцілі Кацю дадому. Не ў хату да Васіля павёз яе Андрэй, а да сваёй маці, каб больш не адпускаць ад сябе ні на імгненне.

Праз адчыненае акно ветрык даносіў духмяны пах акацыі. Напаўняючы пакой, дзе адпачывала стомленая ад жыццёвых сварак маладая жанчына, ён улагоджваў яе, закалыхваў, апускаў у салодкія мроі, дзе было сонечна і вясёлкава.

Удваіх, але не разам

То быў класічны любоўны трохвугольнік: Раман любіў Анастасію, яна — Радзівона, які не звяртаў ніякай увагі на прывабную дачку сяброў сваіх бацькоў. Зрэшты, усе трое хадзілі ў адной кампаніі і добра ведалі адно аднаго, так, як і дрэнна схаваныя далікатныя пачуцці дваіх з гэтай тройцы.

Бацькі ўсіх іх займалі вядомыя пасады ў горадзе, і дзеці па вызначэнні павінны былі адпавядаць іх статусу. Да іх гонару, яны і адпавядалі, скончыўшы ВНУ і атрымаўшы жаданую адукацыю. У кожнага з траіх наперадзе было сталае месца працы, праўда, далёка ад роднага горада.

У памяць аб ціхамірных днях трое вырашылі зрабіць агульную фатаграфію: у цэнтры — Насця, Рома і Родзя злева і справа ад яе. На фота толькі Радзівон усміхаўся весела, Анастасія і Раман глядзелі ў аб'ектыў з непрыхаваным сумам, бо мелася быць расстанне, магчыма, на ўсё жыццё. Гэта і падштурхнула Рамана агучыць, нарэшце, Насці свае пачуцці і прапанаваць ехаць разам з ім у якасці жонкі. Не ведаў ён, што Родзька, каб разнастаіць сваё баўленне часу, ужо некалькі вечароў праводзіў з ёй. Анастасія святілася ад шчасця, будуючы далёкасяжныя планы. На жаль, на жаль...

Родзька перад ад'ездам пажадаў ёй шчасця і як бы няўзнак параіў не адштурхоўваць ад сябе Рому, бо ён так кахае яе.

— А ты? — глытаючы слёзы, у роспачы і з нясмелай надзеяй спытала Насця.

— А я — не. Прабач, спяшаюся, — і хуткім крокам аддаліўся.

Насця адмовілася ехаць з Раманам, у яе сэрцы па-ранейшаму віравалі пачуцці да іншага. Адзінае, што сказала: «Час пакажа».

А калі на кастрычніцкія святы сустрэліся зноў, Раман паўтарыў сваю прапанову. Ад пачутага ў адказ спачатку разгубіўся, а справіўшыся з хваляваннем, пачаў настойваць.

— Я разумею, што ты адчуваеш да Родзі. Але ў такой сітуацыі гэта найлепшае выйсце для ўсіх. Згаджайся, Насця. Будучага малога буду любіць, як свайго.

І памаўчаўшы, цвёрда дадаў:

— Калі Родзя калі-небудзь пакліча цябе, трымаць не буду — адпушчу.

І Насця на гэтых умовах пагадзілася. Сціпла адзначыўшы роспіс у загсе, маладыя з'ехалі ў горад, дзе па размеркаванні працаваў Раман. Горад, дзе нарадзіўся ў сям'і сын, а праз некалькі гадоў і дачушка.

Раман душы ў дзецях не чуў, і яны адказвалі тым жа. На ўзаемнасць разлічваў ён і з боку Насці. А яна ўсе іх сумесныя гады жыла чаканнем нейкага прывіднага шчасця, у якім Родзя нарэшце зразумее і ацэніць яе каханне, аддасць, і не заўважала, што шчасце яе — вось яно, побач.

Размроіўшыся аб нязбытным, яна магла падоўгу глядзець у цемру за акном і не заўважала, як з суседняга пакоя, абсталяванага пад кабінет Ромы, з трывогай і сумам назірае за ёй ён сам. Яго сэрца ў такія хвіліны напаўнялася болем і папрокамі самому сабе: «Не здолеў дастукацца да сэрца нарачонай. Не ўсё зрабіў, каб з ім стала яна шчаслівай».

Толькі дарма дакараў сябе Раман. Тое, што ва ўпор не заўважала жонка, бачылі іншыя. Майстар на ўсе рукі: і кватэру адрамантаваў так, што залюбуешся. І дачу пабудаваў — любата, стварыў на дзесяці сотках сапраўдны райскі куток, дзе Насці дазволена толькі адно — адпачываць, а градкі, клумбы, сад — усё на руках Рамана. І ўсё для яго ненагляднай Насцечкі, яго зоркі, халодны бляск вачэй якой, на жаль, не грэў яго адданае сэрца.

Выраслі дзеці, абзавяліся сваімі сем'ямі, і Анастасія ўсё часцей станавілася задуменнай, маўклівай, часам недарэчы адказвала мужу. Раман мог толькі меркаваць, чым выкліканы такі настрой жонкі.

— Навошта мучыш сябе і мяне? — сказаў ён аднойчы за сняданкам. — Едзь на радзіму. Знаёмыя казалі, туды і Родзька вярнуўся.

Анастасія чула, як грукнулі ўваходныя дзверы, прыбрала са стала і хутка стала збірацца ў няблізкую дарогу. Патлумачыўшы дзецям надуманую прычы-

ну паспешлівай паездкі, папрасіла іх прыглядаць за бацькам. Мала што можа здарыцца. Непапраўнае адбылося ўжо праз некалькі дзён пасля ад'езду. Боль, смутак, безвыходнасць, якія пасяліліся ў сэрцы Рамана, у рэшце рэшт і разарвалі яго...

...Змарнелая, счарнелая Анастасія, накрыўшыся пледам, ужо якую гадзіну нерухома сядзела на канапе з тоўстым агульным сшыткам у руках. Гэта быў дзённік Рамана, які быў перапынены ў апошні яго вечар і выпадкова пакінуты на пісьмовым стале. Скрозь слёзы Анастасія ўчытвалася ў акуратныя радкі, якія апавядаюць пра шчасце, якое так і не здарылася, пра яго вялікае каханне, якое так і засталося неўзаемным, пра дзяцей, якія сталі яго вялікай радасцю і працягам. І ні папроку той адзінай жанчыне, якая была ўсе гады іх сумеснага жыцця побач, але не з ім.

Анастасія выціралa слёзы, якія не давалі ўчытвацца ў сэнс напісанага. Раптам у памяці ўсплыла тая апошняя сустрэча з Радзівонам. Азызлы і нахабны мужчына бязлітасна кідаў ёй у твар словы, якія пякуць агнём:

— Ха, здзівіла, што старэйшы твой ад мяне. Ды толькі ў афіцыйных шлюбах у мяне пяцёра дзяцей. А ўжо на баку... — і Радзівон ухмыльнуўся. — А чаго прыходзіла? — ужо ўслед Анастасіі кінуў ён пытанне і, не атрымаўшы адказу, у здзіўленні пацiснуў плячыма.

— Ромка, мой Ромка. Што ж я нарабіла?! — наўзрыд плакала Анастасія, прыціскаючы да сэрца дзённік і пагладжваючы вокладку, як у рэдкія хвіліны гладзіла валасы мужа. У высокай цемры за акном, каля якога стаяла забітая горам жанчына, ярка мільгацела зорачка. Нібы душа Рамана з незваротнай далечы пыталася-турбавалася: «Як ты там, каханая?»

